# Медаль «Да шлюбу Антонія Генрыха Радзівіла і Луізы Фрыдэрыкі Прускай»

Ганна БЫЛЬ



Старшы навуковы супрацоўнік ДУ «Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж»

У маі 2013 г. нумізматычная калекцыя Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» папоўнілася копіямі 20 медалёў, прысвечаных роду Радзівілаў Мацея Радзівіла (нар. у 1961 г.). Арыгінальную калекцыю, якая складаецца з 22 медалёў, Марыя Ганна Радзівіл (нар. у 1962 г.) – жонка Мацея, атрымала ў спадчыну ад свайго прадзеда Януша Францішка (1880–1967), апошняга алыцкага ардыната, уладара Нябораўскага палаца. У чэрвені 2014 г. музейны збор папоўніўся срэбным юбілейным медалём, прысвечаным 400-годдзю валодання Радзівіламі Нясвіжам, якое прыпала на 1913 г. Такі падарунак зрабіла госця з Італіі Дыяна Марыя Караба-Радзівіл (нар. у 1953 г.), унучка апошняга нясвіжскага ардыната Леана Уладзіслава (1888–1959).

У красавіку 2015 г. Мацей Радзівіл перадаў музею яшчэ адну копію медаля, арыгінал якога быў зроблены берлінскім медальерам Абрагамам Абрамсонам (1754–1811) *(малюнак 1)* у 1796 г. з нагоды шлюбу прынцэсы Луізы Прускай (1770–1836) і Антонія Генрыха Радзівіла (1775–1833) [5, p. 54].




*Малюнак 1*

Гісторыя адносін Антонія Радзівіла *(малюнак 2)* з Луізай Прускай *(малюнак 3)* пачалася ў маі 1795 г., калі Радзівілы ўпершыню былі прадстаўлены каралеўскаму двару ў Белявелі, летняй рэзідэнцыі прынца Аўгуста Фердынанда. Ужо тады бацькі Антонія Генрыха пачалі задумвацца над тым, каб з дапамогай сына зблізіцца з прускім дваром, ажаніўшы яго з прынцэсай Луізай з Гагенцолернаў.



*Малюнак 2*

Лёс шлюбу Луізы Прускай і Антонія Радзівіла быў вызначаны. Пасля падаўлення паўстання Тадэвуша Касцюшкі ў 1794 г. і апошняга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 г. Антоній Радзівіл і яго бацька Міхал Геранім Радзівіл (1744–1831) падтрымлівалі планы адраджэння Рэчы Паспалітай на чале з прускай дынастыяй. У сваю чаргу гэта стварала магчымасць захавання вялікіх зямельных надзелаў на тэрыторыі Польшчы, Беларусі і Украіны, якімі валодаў бацька Антонія Радзівіла. Многія прадстаўнікі прускага каралеўскага двара актыўна віталі ідэю аб шлюбе, разлічваючы на падрымку польскай магнатэрыі на новых землях, якія ўвайшлі ў склад Прусіі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Нездарма з нагоды шлюбу з сілезскага турэмнага замка стараннямі Луізы былі вызвалены ваеннапалонныя часоў паўстання Касцюшкі. Акрамя гэтага, Луізе было ўжо 26 гадоў і яна магла застацца незамужняй. Антоній і Луіза пакахалі адно аднаго.



*Малюнак 3*

Шлюб адбыўся 17 сакавіка 1796 г. у Берліне [3, s. 157]. Вянчанне прайшло згодна з каталіцкім абрадам, але пасля абеду яго зацвердзіў пратэстанскі пастар. Шлюб выклікаў хвалю зайздрасці да Ра-

дзівіла, і становішча маладых у берлінскім палацы не было бясхмарным. Шмат хто быў здзіўлены гэтым польска-германскім і пратэстанцка-каталіцкім саюзам [2, с. 120].

Фрыдэрыка Даратэя Луіза Філіпіна Пруская з'ўлялася дачкой прынца Аўгуста Фердынанда (1730–1813) і маркграфіні Ганны Лізаветы Луізы Брандэнбург-Шведскай (1738–1820), пляменніцай караля Прусіі Фрыдрыха II Вялікага (1712–1786). У сваіх галоўных рэзідэнцыях – Берліне, Познані і Антоніне – Луіза і Антоній прымалі шматлікіх дзеячаў культуры і навукі. У берлінскім доме ў 1796–1815 гг. Луіза трымала літаратурны салон. Яна таксама займалася дабрачыннай дзейнасцю – адкрывала прытулкі для бедных, падтрымлівала навучанне таленавітай моладзі, заснавала першую жаночую школу [1, с. 54]. Княгіня пакінула мемуары, якія былі апублікаваны жонкай яе ўнука Антонія Вільгельма Радзівіла (1833–1904) Марыяй Даротай дэ Кастэлян (1840–1915) у 1911 г. у Парыжы на французскай мове пад назвай «Луіза Пруская: сорак пяць гадоў майго жыцця, з 1770 да 1815»[4] *(малюнкі 4, 5)*. На тытульным лісце гэтай кнігі размешчаны выявы аверса і рэверса медаля ў гонар шлюбу Луізы і Антонія Радзівіла.

Прынцэса Фрыдэрыка Даратэя Луіза падаравала Антонію чатырох сыноў і чатырох дачок, дзве з іх, Луіза і Алена, памерлі яшчэ ў дзяцінстве. Згодна з сямейнай дамоўленасцю, сыны Вільгельм (1797–1870), Фердынанд (1798–1827), Багуслаў (1809–1873) і Уладзіслаў (1811–1831) былі ахрышчаны ў касцёле, а дочкі Луіза (1803–1834) і Ванда (1813–1845) – у пратэстанцкай царкве [2, с. 120,121].



*Малюнак 4*


LOUISE DE PRUSSE
PRINCESSE ANTOINE RADZIWIŁŁ

QUARANTE-CINQ ANNÉES
DE MA VIE
(1770 A 1815)

PUBLIÉ AVEC DES ANNOTATIONS ET UN INDEX BIOGRAPHIQUE
PAR
LA PRINCESSE RADZIWIŁŁ
NÉE CASTELLANE

*Ouvrage accompagné d'un portrait en héliogravure, d'un autographe et de quatorze gravures hors texte*

Deuxième édition

PARIS
LIBRAIRIE PLON
PLON-NOURRIT ET Cie, IMPRIMEURS-ÉDITEURS
8, RUE GARANCIÈRE — 6e
1911
*Tous droits réservés*

*Малюнак 5*

Антоній Генрых Радзівіл увайшоў у гісторыю як палітык, князь-намеснік Вялікага Княства Пазнанскага, ардынат нясвіжскі, алыцкі, а таксама таленавіты музыкант і кампазітар, аўтар музыкі да «Фауста» Гётэ, мецэнат мастацтва.

Копія срэбнага медаля ў гонар шлюбу Антонія Радзівіла *(малюнак 6)* была зроблена ў 2013 г. варшаўскім медальерам Ежы Панасюком. На аверсе знаходзяцца выявы партрэтаў Луізы Прускай і Антонія Радзівіла ў профіль, павернутыя ў правы бок, па краі – кругавая легенда: *LUISA: FERDIN[andi]. PR[incipis]. BOR[ussiae]. COADIUTRIX HERFORDENS[is]. ET A.NTON. PRINCEPS RADZIWIL* (Луіза, дачка Фердынанда, прынца Прускага, саўладальніца ў Херфордзе[1], і князь Антоній Радзівіл). На рэверсе знаходзіцца


*Малюнак 6*

выява Гіменэя[2] ў поўны рост з паваротам улева, мае выгляд мужчыны з крыламі, які трымае ў правай руцэ вянок, у левай – паходню, якой запальвае свяшчэнны агонь (сямейны ачаг) на алтары. Алтар упрыгожаны гірляндай з кветак, за ім знаходзіцца рэльефны пастамент, на якім стаіць багіня Гестыя[3] ў поўны рост з паваротам управа. У левай руцэ багіня трымае посах, у правай – паладый (атрыбуты багіні Афіны[4]: карынфскі шлем, эгіда[5] і дзіда). У аснове пастамента – ініцыялы медальера: *A/S* (Абрамсон), па краі – кругавая легенда: *FELICIBUS OMINIBUS IUNCTI* (злучаны шчаслівымі знаменнямі), у ніжняй частцы медаля – радковая легенда: *BEROL./ MDCCXCVI* (Берлін, 1796).

Традыцыя вырабу медалёў Радзівіламі ў гонар шлюбу вядома яшчэ з пачатку XVI ст. У нясвіжскай манетна-медальнай калекцыі ёсць два медалі да 5-годдзя шлюбу Януша Радзівіла (1579–1620)

*[1] Херфордскае абацтва – жаночы манастыр, заснаваны ў 789 г. у складзе Свяшчэннай Рымскай Імперыі, які падпарадкоўваўся ў свецкіх пытаннях непасрэдна імператару і які валодаў правам тэрытарыяльнага суверэнітэту на землях, якія яму належаць, быў секулярызаваны ў 1803 г. Стрыечная цётка Луізы Прускай Фрыдэрыка Шарлота Брандэнбург-Шведская (1745–1808) з'ўлялася апошняй абацісай Херфордскага манастыра.*

*[2] Гіменэй – (у грэч. міф.) бог шлюбу.*

*[3] Гестыя – (у грэч. міф.) багіня, заступніца сямейнага ачага і ахвярнага агню.*

*[4] Афіна – (у грэч. міф.) багіня вайны і мудрасці.*

*[5] Эгіда – (у грэч. міф.) шчыт Зеўса, зроблены са шкуры казы.*



***Малюнак 7***



***Малюнак 8***

і Эльжбеты Соф'і Брандэнбургскай (1589–1629) у 1617 г. *(малюнак 7)* і да шлюбу Багуслава Радзівіла (1620–1669) і Ганны Марыі Радзівіл (1640–1667) у 1665 г. *(малюнак 8)*.

Адметнасцю гэтага медаля, у адрозненне ад іншых Радзівілаўскіх медалёў, з'яўляецца зварот не да барочных алегорый (сонца, якое ўзыходзіць; арол, які хоча ўзляцець; шпага з лаўровым вянком на ёй; «Усёвідушчае Вока» і іншае), а да антычных сімвалаў.

Колькасць асобнікаў медаля ў гонар шлюбу Антонія Радзівіла і Луізы Прускай невядома. Сёння арыгіналы медаля захоўваюцца ў прыватнай калекцыі Мацея Радзівіла ў Польшчы, у літоўскага калекцыянера А. Кубілы і Дзяржаўным Эрмітажы ў Санкт-Пецярбургу.

Такім чынам, нават у канцы XVIII ст., пакінуўшы радзіму, Радзівілы працягнулі традыцыю ўвекавечвання важных сямейных падзей, у прыватнасці, шлюбу з прадстаўніцай манаршай дынастыі. Медаль з'яўляецца не толькі помнікам медальернага мастацтва, але і крыніцай гісторыі берлінскай лініі Радзівілаў. З-за рэдкасці гэтага медаля і знаходжання яго асобнікаў у прыватных калекцыях вялікае значэнне мае выраб копій для экспанавання ў агульнадаступнай экспазіцыі Нясвіжскага замка.

***Крыніцы:***

1. *Зварыка, І. Партрэт вядомай. Да пытання атрыбутацыі партрэта невядомай са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь / І. Зварыка // Музейны веснік. – Мінск. – 2011. – № 5. – С. 53–61.*

2. *Метельский, А.А. Двенадцатый несвижский ординат: Антоний Генрик Радзивилл // Владельцы старого Несвижа / А.А. Метельский. – Минск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – С. 120–124.*

3. *Galos, A., Nowak-Romanowicz, A. Radziwiłł Antoni Henryk / A. Galos, A. Nowak-Romanowicz // Polski słownik biograficzny. – T. XXX, z. 2. – Wrocław-Warszawa-Kraków-Gdańsk-Łódź, 1987. – S. 157.*

4. *Quarante-cinq années de ma vie (1770 à 1815). Publié avec des annotations et un index biographique par la princesse Radziwill, née Castellane / Louise de Prusse. – Paris: Plon-Nourrit, 1911. – 453 p.*

5. *Ruzas, V. Radvilų medaliai. Katalogas / V. Ruzas. – Vilnius: Lietuvos nacionalinis muziejus, 1993. – P. 54.*